ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Настаўніцкая газета

№ 109 (6918)

Субота, 4 верасня 2010 года

Выходзіць з 20 снежня 1945 года



# Першы ўрок — у храме ведаў

**Свой першы ўрок у новым навучальным годзе вучні 4 класа сталічнай гімназіі №1 імя Францыска Скарыны правялі не ў знаёмым класе за звыклымі партамі, а ў храме навукі і ведаў — у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Такая форма правядзення Дня ведаў ужо стала добрай традыцыяй (першы ўрок у бібліятэцы для вучняў гімназіі прайшоў у 2008 годзе).**

— Стратэгія сталічнай адукацыі накіравана на тое, каб мы маглі выкарыстоўваць усе прапанаванні соцыуму. Нацыянальная бібліятэка для нас і ёсць такое прапанаванне, — адзначыла дырэктар гімназіі Наталля Уладзіміраўна Бушная. — Наогул, для таго каб ісці ў нагу з часам, трэба актыўна выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі. Але пры гэтым нельга забываць пра тыя рэчы, на якіх першапачаткова фарміравалася адукацыя. А гэта, вядома ж, кнігі. Нацыянальная бібліятэка — велізарны храм кніг, у якім выкарыстоўваюцца і сучасныя тэхналогіі. Можна сказаць, што гэта храм традыцый і наватарства. Падчас яго наведвання ў дзяцей фарміруюцца патрэбныя для грамадзяніна каштоўнасныя якасці.

Пачалося мерапрыемства з урачыстай лінейкі. Сустракаў вучняў "магістр навук", ролю якога выконваў адзінаццацікласнік гімназіі Глеб Карней, а з віншаваннямі і прывітальным словам выступіла намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Людміла Генадзьеўна Кірухіна. Яна адзначыла, што кіраўніцтву бібліятэкі вельмі прыемна, што такі важны дзень дзеці сустракаюць у храме ведаў.

— Я вельмі спадзяюся, што наша бібліятэка стане яшчэ адным родным домам для школьнікаў, — падкрэсліла Людміла Генадзьеўна. — Чым раней яны да нас прыйдуць, тым больш паспяховымі стануць у жыцці, тым лепш пазнаюць каштоўнасці свету і стануць сапраўднымі патрыётамі сваёй краіны.

Пасля лінейкі ўсе адправіліся на першы ўрок "Беларусь — краіна маёй будучыні".

Настаўніца малодшых класаў Алена Мікалаеўна Паграбенкава падрыхтавала насычаную праграму па названай тэме. Спачатку дзеці расказалі, што для іх значыць слова "Айчына". Канечне, гэта і родны дом, і бацькі, і зямля, на якой яны нарадзіліся. Захапленне ў бацькоў і настаўнікаў выклікаў адказ дзяцей на пытанне, які галоўны цуд нашай краіны. Хлопчыкі і дзяўчаты ўсе разам сказалі: "Мы!"

Падчас вікарыны вучні ўспаміналі вядомых беларускіх пісьменнікаў, касманаўтаў, спартсменаў і нават называлі футбольныя клубы. Аказалася, што дзеці добра ведаюць айчынныя прадпрыемствы і тую прадукцыю, якую яны выпускаюць.

Гімназісты не забылі пахваліцца і сваімі аднакласнікамі-чэмпіёнамі. А іх не так ужо і мала: гэта пераможца першынства шахматнай школы Аляксей Свярчкоў, лаўрэат песенных конкурсаў "Усміхніся, зорачка", "Вясновы зарапад" Ганна Войтава, пераможца міжнароднага турніру па тэквандо ў Чэхіі Арцём Сушкевіч і пераможца першынства ДЮСШ па фігурным катанні Настасся Грышанава.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

**Вниманию специалистов общеобразовательных школ и других учебных заведений**

Для оснащения кабинетов физики и проведения демонстрационных опытов в лабораторных условиях ОАО "ВЗЭП" готово изготовить и поставить следующее оборудование:

- наборы учебно-демонстрационные (4 комплекта);
- генераторы звуковые функциональные (школьные);
- наборы соединительных проводов;
- источники питания лабораторные;
- источники питания демонстрационные.

**Тел./факс (80212) 37-32-08; 37-01-72.**
**WWW.vzep.vitebsk.by**
**E-mail: vzep_kc@vitebsk.by**

УНП 300125187.

# Некаторыя таямніцы правядзення ЦТ сталі вядомы мінскім адзінаццацікласнікам

**1 верасня будучыя выпускнікі гімназій Савецкага раёна сталіцы былі запрошаны ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Такім чынам яны атрымалі ўнікальную магчымасць непасрэдна азнаёміцца з сістэмай падрыхтоўкі тэставых матэрыялаў і апрацоўкай бланкаў адказаў, ацаніць узровень захавання сакрэтнасці экзаменацыйных заданняў, задаць пытанні спецыялістам РІКВ і пачуць вычарпальныя адказы.**

Гімназісты адразу звярнулі ўвагу на тое, што ў кожным памяшканні Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў змешчаны відэакамеры, якія днём і ноччу фіксуюць усё, што адбываецца ўнутры будынка. Але відэакамеры — гэта ўсяго толькі адзін фрагмент вельмі складанай сістэмы інфармацыйнай абароны, якая ахоплівае ўвесь працэс цэнтралізаванага тэсціравання ад падрыхтоўкі тэставых заданняў да моманту дастаўкі іх да абітурыентаў, апрацоўкі вынікаў і выдачы сертыфікатаў.

Спосаб доступу да сейфаў, дзе захоўваюцца тэставыя матэрыялы, напэўна, запазычаны з банкаўскай сферы. Напрыклад, каб узяць ноўтбук з тэстамі, патрэбна прысутнасць траіх людзей, у аднаго з якіх — ключ ад пакоя, у другога — ключ ад сейфа, а ў трэцяга, метадыста, — ключ ад ячэйкі, дзе ляжыць запламбіраваны ноўтбук з заданнямі па канкрэтным прадмеце. Адметна, што свае ключы гэтыя людзі захоўваюць таксама ў сейфах, а пакой знаходзіцца пад пільным прыцэлам відэакамер, якія фіксуюць і запісваюць усе дзеянні.

Сёння з банка тэставых заданняў, што захоўвае РІКВ, можна сфарміраваць тысячы варыянтаў. Гэты банк пастаянна папаўняецца і падтрымліваецца ў актуальным стане — калі, напрыклад, мяняецца вучэбная праграма, то змены адлюстроўваюцца ў змесце тэстаў.

Як заўважыла намеснік дырэктара РІКВ Ядвіга Станіславаўна Бескаравайная, тэсты менавіта ў тым выглядзе, якімі іх атрымліваюць абітурыенты, з'яўляюцца на свет (фарміруюцца і "вымаюцца" з камп'ютара) строга напярэдадні правядзення тэсціравання. З гэтага моманту доступ да іх мае толькі адзін чалавек — метадыст па канкрэтным прадмеце, і менавіта ён ажыццяўляе тыражаванне і пакетаванне тэставых заданняў. Метадыст дакладна ведае, што ў выпадку любой уцечкі інфармацыі віна будзе ляжаць толькі на ім. Дадатковай гарантыяй захавання канфідэнцыяльнасці тэставых заданняў служыць і той факт, што, калі ў метадыста дзеці з'яўляюцца абітурыентамі, у той год ён устараняецца ад работы з тэстамі.

Такім чынам, паміж метадыстам, які тыражуе і пакетуе тэставыя заданні, і абітурыентамі пасрэднікаў няма. Усе, хто адпраўляе і прымае экзаменацыйныя матэрыялы ў пунктах тэсціравання, будуць мець справу з запячатанымі пакетамі высокай ступені абароненасці ад несанкцыянаванага распячатвання. Да таго ж Беларусь з'яўляецца адзінай краінай у свеце, дзе дастаўку тэставых матэрыялаў ажыццяўляе дзяржаўная фельд'егерская служба, якая па родзе сваёй дзейнасці мае справу толькі з матэрыяламі выключнай сакрэтнасці. Такім чынам, пакеты распячатваюцца толькі ў прысутнасці абітурыентаў перад самым пачаткам тэсціравання.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# У БДПУ адкрыўся 91 сезон Купалаўскага тэатра, а МІПСА сустрэў новы навучальны год сертыфікатам ISO

**Традыцыйна многія ВНУ прысвячаюць Дзень ведаў першакурснікам. Аб тым, наколькі гасцінна прымаюць новае пакаленне студэнтаў у вышэйшай школе і якое значэнне надаюць іх паяўленню, сведчыць маштаб мерапрыемстваў і акцый, падрыхтаваных вышэйшымі навучальнымі ўстановамі да 1 верасня.**

**Нагадаем, што сёлета першакурснікамі сталі амаль 93 тысячы чалавек, з іх у дзяржаўных ВНУ будуць вучыцца 80,5 тысячы чалавек, а ў прыватных — 12,4 тысячы.**

Выдатны падарунак падрыхтавалі для сваіх студэнтаў на Дзень ведаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Менавіта 1 верасня ў гэтай установе адкрыўся 91 сезон Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Артысты Купалаўскага, будынак якога зараз закрыты на рэстаўрацыю, упершыню выйшлі на сцэну педагагічнага ўніверсітэта і сыгралі свой знакаміты спектакль "Паўлінка". На ўрачыстым сходзе, які папярэднічаў пастаноўцы, рэктар БДПУ Пётр Кухарчык даў першакурснікам наказ: "Каб стаць паспяховымі ў жыцці, трэба любіць вучыцца". А генеральны дырэктар тэатра Павел Палякоў паабяцаў, што студэнты БДПУ будуць першымі гледачамі спектакляў на адрэстаўраванай сцэне.

Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта змаглі наведаць службу ў мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы, якую правёў у гонар Дня ведаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, рэктар Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ. Свецкая частка свята прайшла ў Палацы спорту. Яна складалася з тэатралізаванай шоу-праграмы з удзелам рэктара ўніверсітэта Сяргея Абламейкі, дэканаў факультэтаў і, канечне, першакурснікаў, якія далі клятву студэнта. Кульмінацыяй стала выступленне расійскай поп-зоркі Сяргея Лазарава.

Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін таксама парадаваў сваіх студэнтаў прыемным сюрпрызам: 1 верасня на ўрачыстай цырымоніі ў Палацы культуры прафсаюзаў гэтая ВНУ атрымала міжнародны сертыфікат ISO. МІПСА — першая прыватная ВНУ, якая стала ўладальнікам сертыфікату адпаведнасці сістэмы менеджменту якасці патрабаванням стандарту ISO 9001:2008 з акрэдытацыяй у Вялікабрытаніі. Магчыма, першакурснікам было б цяжка зразумець значэнне гэтай падзеі, але прадстаўнік англійскага незалежнага бюро па сертыфікацыі, які прысутнічаў на цырымоніі, патлумачыў: "Сертыфікат ISO — добрая візітоўка для прыцягнення замежных студэнтаў, замежных інвестыцый і пашырэння экспартнага патэнцыялу інстытута". Гэта высокая ацэнка, прызнанне дастойнага ўзроўню адукацыі ў ВНУ, што ў далейшым будзе садзейнічаць пашырэнню міжнародных сувязей у галіне навукі, абменам вучэбнымі праграмамі, выкладчыкамі, студэнтамі з вядучымі ўніверсітэтамі замежжа.

**Аляксандр АНДРЫЯНАЎ.**